*УДК 821.161.3*Хадановіч:141.32*

**А. В. Анцімонік**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# АДМЕТНАСЦЬ УВАСАБЛЕННЯ ЭКЗІСТЭНЦЫЙНЫХ МАТЫВАЎ У ТВОРЧАСЦІ А. ХАДАНОВІЧА

У артыкуле разглядаецца спецыфіка ўвасаблення экзістэнцыйных матываў у творчасці А. Хадановіча. Зроблена выснова, што, нягледзячы на агульную аптымістычную танальнасць лірыкі паэта, у ёй актуалізаваны такія праблемы, як жыццё і смерць, адзінота, спасціжэнне ўласнага «Я», светаўладкаванне, пошук сэнсу жыцця, пытанні выбару і свабоды, што вырашаюцца ў рэчышчы постмадэрнісцкай эстэтыкі, а найперш – праз іранізаванне, разамкнёную структуру тэксту і разлік на саўдзел рэцыпіента.

Да асэнсавання экзістэнцыйных праблем (пошуку сэнсу жыцця, праяў трагічнага светаўспрымання – смерці, страху, адзіноты, пакуты, – непрыняцця грамадства, абсурднасці свету і спробаў яе пераадолець, пытання свабоды, праблемы выбару, спасціжэння ўласнага «Я», кахання і расчаравання і інш.) на сваім творчым шляху звяртаюцца многія пісьменнікі. У кантэксце своеасаблівасцей іх вырашэння цікавым будзе разгляд арыгінальнай творчасці Андрэя Хадановіча з яе нязменнай аптымістычнай танальнасцю. Г. Кісліцына вызначыла стыль паэта як «ружавашчокі дэкаданс» [1, с. 6], падкрэсліваючы, што аўтар «здаецца “ненармальна” жывым, вясёлым і ўлюбёным ў свой час» [1, с. 12]. Пераважная большасць экзістэнцыйных матываў раскрываецца ў першых зборніках творцы, асабліва яскрава праяўляючыся ў кнізе «Лісты з-пад коўдры» (2004).

Найбольш выразна ў лірыцы А. Хадановіча выяўляецца апазіцыя «жыццё – смерць». У гэтым супрацьстаянні відавочна перамагае вітальнае гучанне, што не ўпісваецца ў апрыёрную трагічнасць экзістэнцыяльнага светаўспрымання «памежнага» чалавека (трагічнасць з-за немагчымасці раз і назаўсёды вырашыць экзістэнцыйныя праблемы індывідума, якія пастаянна прысутнічаюць у яго быцці). Але ў лірычнага героя твораў паэта здараюцца часы заклапочанасці, калі ён заўважае «рэчышча мёртвага рэчыва» («Шызабары») [2, с. 17] і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вымушаны «ў пыльнай шуфлядзе трымаць рэвальвер» («Дачакаць!») [3, с. 73], задумваючыся: «Як не здохнуць у гэтай радзільні старых немаўлятаў?» («Як дажыць да юнацтва й знайсці маладога равесніка…») [4, с. 58]. Асаблівасцю рэалізацыі матыву смерці ў творчасці А. Хадановіча можна лічыць перажыванне суб’ектам лірыкі не столькі свайго непазбежнага скону, колькі раўнадушную канстатацыю ім адыходу на той свет іншых людзей. Так, чытач мае магчымасць асэнсаваць смерць «тлумача ва ўласным перакладзе» («Смерць тлумача») [2, с. 20], Францішка Сапегі «ад нуды» («Францішак Сапега») [5, с. 23], маці, пра спачын якой «проста нагадвае» («Плакалі, знаем!») [6, с. 109] яе трохгадовы сын.

Пры агульнай пазітыўнай настраёвасці ў вершаваных творах А. Хадановіча закранаецца і праблема самазабойства («Спеў аб маім суіцыдзе», «Курдупель Мур», «фантазіі ў манеры віктара жыбуля» і інш.), якую А. Камю лічыў найважнейшай праблемай філасофіі: «Ёсць толькі адна па-сапраўднаму сур’ёзная філасофская праблема – праблема самазабойства. Вырашыць, вартае ці не жыццё таго, каб яго пражыць, – значыць адказаць на фундаментальнае пытанне філасофіі» [7, с. 24]. З характэрнай для постмадэрнісцкай эстэтыкі ironіяй, што не прадугледжвае этычнай ацэнкі падзей, праблема самагубства ў творах паэта ўвасабляецца пры дапамозе гульні слоў, як, напрыклад, у вершы «Спеў аб маім суіцыдзе»:

Ён з маленства пабойваўся моргаў
і ў сырую не мкнуўся зямлю,
ды прасцюжаны фатум зашморгаў,
і зашморгваў на шыі пятлю [2, с. 20].

Але ў разуменні лірычнага суб’екта чалавек, нягледзячы ні на якія абставіны, павінен рэалізаваць сябе напоўніцу, каб быць упэўне- ным у тым, што ён сапраўды жыве, а не існуе. Нездарма ў вершы «Мастацтва выжывання» сустракаем радкі: «Калі прачынаешся зранку, / упэўніся, што жывы» і «<…> Шчэ дзень у нябыту выкраў – / змагайся ж, такі закон» [3, с. 77]. Занепакоенасць і страх (апошні ў творчасці А. Хадановіча заўважаецца толькі ў адзінкавых вершах і старанна камуфлюецца смехам) суб’екта лірыкі наконт пустога, бессэнсоўнага і непрадуктыўнага жыцця прасочваецца ў вершах «III. Гамункул», «Дачакаць!», «Мастацтва выжывання», «Латарэя» і некаторых іншых. Герою-жыццялюбу неабходна атрымліваць асалоду ад кожнага імгнення, а калі ўжо і паміраць, дык «ад любові да жыцця» («fourth level») [3, с. 137]. Перажыванні наконт неасэнсаванага і «несапраўднага» існавання настолькі трывалыя, што часам набываюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дыдактычнае гучанне, форму парады, як, да прыкладу, у вершы «Мастацтва выжывання»:

Шукацьмем свае сугуччы
у прыцемках нас саміх,
каб потым не стала балюча
за марна страчаны міг [3, с. 79].

Адсюль заканамернае ўзнікненне ў вершатворчасці А. Хадановіча матываў пошуку сэнсу жыцця. Ад даволі банальнага сцвярджэння: «Бо за цемрай раней ці пазней паўстае / непазбежная раніца, велічны золак!» («Падвойны агент») [3, с. 16] – лірычны герой прыходзіць да рытарычнага пытання: «Куды знікае ўчора й дзе / канец тваім прыгодам?» («Няма чаго лавіць, апроч…») [4, с. 43]. Тым самым падкрэсліваецца неадназначнасць, складанасць і нават немагчымасць сталага і адзінага адказу на адвечнае пытанне чалавека, для чаго ён жыве. Здольнасць «сумаваць па страчаным сэнсе» («first level») [3, с. 130] можа прывесці індывіда да ўнутранага канфлікту, у выніку чаго канкрэтная асоба будзе абвострана адчуваць навакольны свет, а значыць, хутчэй за ўсё, асэнсоўваць сваю мізэрнасць у параўнанні з Сусветам і ўсведамляць уласную самоту як балючую дадзенасць.

Менавіта адзінота з'яўляецца другім больш-менш выразна акрэсленым экзістэнцыйным матывам у лірыцы А. Хадановіча, гучанне якога дасягае свайго апагею ў вершы «Аповесць пра сапраўднага чужынца» пры дапамозе нагрувашчвання ў паэтычнай прасторы аднакаранёвых слоў:

Кожны – прынамсі аднойчы – адчуе,
што ён натуральны чужанец (перапрашаю, чужынец), адчуе
любою сваёю чужынскай вантробай,
кожнай чужынскай душэўнаю фібрай,
адчуе, што ён тут – пабочнай асобай [2, с. 50].

Праз катэгорыю адчужанасці ствараецца адмысловае спецыфічнае ўспрыняцце адзіноты лірычным героем, якое накіравана на падкрэсліванне натуральнасці гэтай з'явы і немагчымасці яе пераадолення («3. Готыка», «апрануты ў рымскую тогу…», «(сто пудоў адзіноты)» і інш.). Таму ў вершах дадзенай скіраванасці час ад часу гучыць сапраўдны адчай. Верагодна, чалавек і яго сутнасць у свеце бачыцца лірычнаму герою верша «Маленькі жабрак» наступным чынам: гэта тапелец, які прачнуўся ў незнаёмым «паветры без вады» [3, с. 66]

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у абсалютнай адзіноце і спрабуе дыхаць жабрамі, ён «самотнай ружай кінуты ў сусвет» [3, с. 66].

Значнае месца ў вершатворчасці паэта адведзена пытанням светаўладкавання. Як і пры асэнсаванні феноменаў смерці і жыцця, у вершаторах А. Хадановіча прадстаўлены дзве супрацьлеглыя думкі, а права выбару адной з пазіцый належыць рэцыпіенту. Так, лірычны суб'ект твора «Ліст на свабоду» гаворыць прама:

Мы валім дрэвы, чэшам калені,
капаем катлаваны і каналы,
чакаем на спатканні, лічым дні,
й абагаўляем свет наш дасканалы.
Бо верым: навакольнае лайно
цудоўным гноем станецца ў гасподзе [3, с. 80].

Насуперак гэтаму доваду суб'ект лірыкі зборніка «Бэрлібры» прамаўляе: «Гэты свет цудоўны, / бо хіба ж не цуд – / прамовіць такую банальнасць / і не памерці ад сораму» («Чэмпіянат свету па акынскай паэзіі») [6, с. 21]. І ўсё ж, калі браць колькасную перавагу меркаванняў, то яна на баку першага «прамоўцы» і прадстаўлена вершамі «Ліст на свабоду», «second level», «падарожжа».

Немалаважная роля сярод экзістэнцыйных праблем у творчасці А. Хадановіча належыць паняццям свабоды і выбару. У асэнсаванні катэгорыі свабоды лірычны герой робіць спробу метафарычна патлумачыць дадзены феномен: «<…> свабода – начное кіно не для ўсіх» («Начная свабода») [4, с. 89], а таксама вызначыць яго межы:
«Вольны стыль па калюжах – апошняя мера свабода» («Сярод шэрага дня не ўратуе асляплага морква…») [4, с. 90]. Час ад часу ў вершах ўзнікаюць папераджальныя ноты: суб'ект лірыкі або разважае аб небяспецы такіх выпадкаў, калі «вабіць caelum» («стэфану малармэ з удзячнасцю») [2, с. 44], або звязвае свабоду з болем, калі «пад рэбрамі коле» («Час перайсці ад словаў да явы…») [3, с. 109]. Усведамленне сутнасці феномена свабоды займае думкі лірычнага героя ў лірычных творах «Па-за вокнамі – бы ў заапарку…», «Underground», «Трызненне сівой кабылы» і інш.

Вырашэнне праблемы выбару ў творчасці паэта неадназначнае і залежыць ад асабовых якасцей таго індывіда, які выбірае. Так, лірычны суб'ект верша «Макабрычныя скокі» сцвярджае: «<…> косы, шыбеніцы ці кулі – / справа густу» [2, с. 24], – а ў творы «Вы- бар» абазначаная ў назве катэгорыя ўяўляецца натуральнай для чалавека, і ён абірае «…вольнасць / як абіраюць бульбу» [2, с. 37]. У рэшце рэшт, чытач можа прыняць да ўвагі параду:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Два шляхі да нірваны ўявіце
й выбірайце, вагаючы шалі:
раставаць пакрысе ў краявідзе
ці высоўвацца, каб заўважалі [3, с. 112].
(«Там, на памежжы…»)

Яшчэ адзін экзістэнцыйны матыў лірыкі А. Хадановіча, які ў сваім вырашэнні прадугледжвае саўдзел рэцыпіента, – гэта спасці- жэнне ўласнага «Я» і звязанае з ім непрыняцце грамадства («Ноч салідарнасці», «fourth level», «Chansons de geste», «дзяўчынка натуе сны…» і інш.). Пералічаныя вершы не даюць яскравага партрэта лі- рычнага героя і яго сталага асэнсавання сябе як асобы, а таксама не дэманструюць яго яўнай непрыязнасці да людзей, але чытач мае магчымасць самастойна дадумаць верагодны варыянт развіцця аўтарскай думкі.

Такім чынам, у аптымістычнай, жыццесцвярджальнай паэзіі А. Хадановіча знайшлі сваё месца такія, характэрныя для свядомасці «памежнага» чалавека, экзістэнцыйныя матывы, як жыццё і смерць, спасціжэнне ўласнага «Я», адзінота, выбар, свабода, суіцыд, светаўладкаванне, пошук сэнсу жыцця і інш. Аднак іх увасабленне не ўпісваецца ў агульную парадыгму беларускай лірыкі канца ХХ стагоддзя, бо прадугледжвае іранічнасць асэнсавання, шматварыянтнасць ісціны і верагодны саўдзел рэцыпіента, што характэрна эстэтыцы постмадэрнізму.

## Спіс літаратуры


1 Кісліцына, Г. Дыстрыбутар харызмы / Г. Кісліцына // Хадановіч, А. Старыя вершы / А. Хадановіч. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2003. – С. 5–12.

2 Хадановіч, А. Старыя вершы / А. Хадановіч. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2003. – 120 с.

3 Хадановіч, А. Лісты з-пад коўдры: вершы / А. Хадановіч. – Мінск: Логвінаў, 2004. – 150 с.

4 Хадановіч, А. Сто лі100ў на tut.by: паэзія / А. Хадановіч. – Мінск: Логвінаў, 2007. – 136 с.

5 Хадановіч, А. Несымэтрычныя сны / А. Хадановіч. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2010. – 120 с.

6 Хадановіч, А. Бэрлібры: гісторыя ў чатырох фільмах / А. Хадановіч. – Мінск: Логвінаў, 2008. – 114 с.

7 Камю, А. Миф о Сизифе / А. Камю // А. Камю. Бунтующий человек. Философия. Политика. Искусство. – М.: Полиздат, 1990. – С. 23–100.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ